# Пад шатамі пальмы першынства



**Чацвёртакурсніца Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Даніэла Цеплякова паспрабавала некалькі творчых напрамкаў: дзевяць гадоў займалася сучаснымі танцамі, пяць — гімнастыкай... Але цяпер галоўную ролю ў жыцці таленавітай дзяўчыны іграе вакал. Нядаўна яна заваявала першае месца на конкурсе выканаўцаў моладзевай песні XVI фестывалю "Моладзь — за Саюзную дзяржаву".**

## ТВОРЧАСЦЬ З КАЛЫСКІ

Дзяцінства Даніэла Цеплякова апісвае з асаблівай цеплынёй:

— Маю энергію бацькі накіроўвалі ў мірнае рэчышча, таму я займалася плаваннем, спартыўнай гімнастыкай, танцамі і, вядома ж, музыкай. Спевы і фартэпіяна пачала асвойваць у музычнай школе, калі мне было шэсць гадоў. Не скажу, што гэта адразу прынесла плён.

Першым вакальным спаборніцтвам Даніэлы стаў Рэспубліканскі фестываль-конкурс дзіцячага мастацтва "ЛьВёнок", на якім яна ўдастоілася трэцяга месца.

— У падлеткавым узросце я зразумела, што хачу звязаць будучыню са спевамі, — дзеліцца ўспамінамі наша гераіня. — Бацькі заўсёды падтрымлівалі мае пачынанні і выбар. І да гэтага часу ідуць поплеч, радуючыся маім творчым перамогам.

Спартыўнае мінулае, паводле слоў Даніэлы, прыдалося ў вакальнай кар'еры. Дзякуючы танцавальным навыкам і развітой пластычнасці спявачка адчувае сябе на сцэне больш упэўнена, не баіцца тэхнічнай імправізацыі.

— Скажу шчыра: перад выступленнем хвалююся заўсёды, але бяру сябе ў рукі і канцэнтруюся на задачах, якія павінна выканаць. З досведам і павелічэннем колькасці выхадаў да публікі страх перарастае ў задавальненне ад таго, што раблю.

## БЕЗ АДРЫВУ АД ВУЧОБЫ

Даніэла скончыла школу мастацтваў у Гомелі, а хутка завершыць падрыхтоўку ў Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў па спецыяльнасці "Мастацтва эстрады (спевы)".

— Вучоба ў каледжы дае добрую базу, што ні ў якім іншым месцы я б не атрымала. З педагогам па вакале Святланай Аляксандраўнай Борахавай працуем ужо чацвёрты год. Настаўнік не толькі дапамагае з пастаноўкай голасу і выбарам песень, але і падтрымлівае. Дзякуючы Святлане Аляксандраўне, ува мне выпрацаваўся стрыжань, карысны на ўсіх выступленнях.

На рахунку маладой вакалісткі прызы многіх беларускіх і міжнародных творчых спаборніцтваў. Так, Даніэла — лаўрэат другой ступені IX Адкрытага конкурсу юных выканаўцаў эстраднай песні "Маладзічок-2021" і пераможца Міжнароднага вакальнага конкурсу-фестывалю "Зорка эстрады". Сёлета ў нашай гераіні таксама багата дасягненняў: акрамя як першым месцам на конкурсе выканаўцаў моладзевай песні XVI фестывалю "Моладзь — за Саюзную дзяржаву", дзяўчына ўганаравана спецыяльным прызам ад Парламенцкага Сходу Беларусі і Расіі.

— Фестываль застанецца ў маёй памяці надоўга, добрыя эмоцыі пакінулі арганізацыя мерапрыемстваў, горад і госці. Гэта ўдзельнікі з розных куткоў Беларусі і Расіі, што з'ехаліся ў Смаленск, моцныя вакалісты. Нягледзячы на канкурэнцыю, з многімі паспела пазнаёміцца і нават пасябраваць.

Самым яркім момантам форуму Даніэла лічыць цырымонію ўзнагароджання.

— Пачуўшы сваё імя, перажыла поўны спектр розных станаў — ад моцнага шоку да абсалютнага шчасця. Разумела, што выступіла годна, аднак такая высокая ўзнагарода стала сюрпрызам. Выконваючы першы нумар, вельмі хвалявалася, але да другога выхаду на сцэну ўзяла сябе ў рукі. Я паглыбілася ў атмасферу песні, у яе змест і адпусціла трывогу.

Перш за ўсіх пра перамогу напісала Святлане Аляксандраўне, бо гэты шлях мы прайшлі разам. Педагог падабрала музычныя творы, якія поўнасцю раскрылі мой тэмбр, дыяпазон і дазволілі прадэманстраваць тэхніку выканання ў цэлым.

## КУРС — НА ВЯЛІКУЮ СЦЭНУ

Даніэла падкрэслівае, што мэты дасягаюцца толькі праз самаразвіццё і пастаянную вучобу.

— Пасля каледжа планую працягнуць адукацыю ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Надаю ўвагу не толькі тэарэтычным ведам — сачу за іншымі выканаўцамі беларускай і замежнай эстрады. Нешта вылучаю для сябе і сваёй творчасці.

Вакалістка расказала, што хоча стаць артысткай вялікай сцэны і дзяліцца мастацтвам з людзьмі.

— Прыадкрыю сакрэт: мая першая аўтарская песня ўжо запісана. Веру, што неўзабаве змагу прадставіць яе на розных пляцоўках!

**Ульяна КАСЦЮНІНА**
Фота аўтара

# Трамплін у будучыню

**Беларусы заваявалі прызавыя месцы на конкурсе выканаўцаў моладзевай песні XVI фестывалю "Моладзь — за Саюзную дзяржаву", якія праходзіў у верасні ў Расіі.**

Артысты выступілі ў двух аддзяленнях, прадставіўшы патрыятычную кампазіцыю і песню, якая адлюстроўвае праблемы новага пакалення.

Старшыня журы, расійскі спявак, кампазітар, саўндпрадзюсар **Аляксандр Елаўскіх**, звяртаючыся да канкурсантаў, падкрэсліў:

— Удзел у гэтым творчым спаборніцтве — ужо перамога. Яно з'яўляецца своеасаблівым трамплінам у светлую будучыню. Верце ў сябе і ідзіце да канца за марай.

Прызавыя месцы падзялілі беларусы і расіяне. Пераможцамі ад нашай краіны сталі гамяльчанка Даніэла Цеплякова (дыплом I ступені), Андрэй Кот з Оршы (дыплом II ступені) і мінчанка Ангеліна Васілеўская (дыплом III ступені).

Беларускія ўдзельнікі таксама атрымалі спецыяльныя прызы: за любоў да роднага краю — студэнтка Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Ганна Варанко, за творчы патэнцыял — артыст адукацыйна-прадзюсарскага цэнтра "Галасы" Эміль Хаспулатаў.

Фестываль "Моладзь — за Саюзную дзяржаву" — маштабны творчы і адукацыйны форум, накіраваны на стварэнне адзінай культурнай прасторы Саюзнай дзяржавы, умацаванне сяброўства беларусаў і расіян — прадстаўнікоў новага пакалення. Мэта фестывалю — развіццё найлепшых ідэй у галіне сучаснага моладзевага руху, наладжванне супрацоўніцтва паміж моладзевымі аб'яднаннямі, а таксама выяўленне і падтрымка талентаў.



Падчас урачыстага адкрыцця фестывалю "Моладзь — за Саюзную дзяржаву"